# Калейдаскоп

люты 2024

**Школьная газета №6 (56)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**люты 2024**

---

**Родная мова**

**З легендаў і казак былых пакаленняў,**
**З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,**
**З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,**
**З грымучага ззяння бурлівых крыніц.**
**З птушынага шчэбету, шуму дубровы,**
**І з гора, і з радасці, і з усяго**
**Таго, што лягло назаўсёды ў аснову**
**Святыні народа, бяссмерця яго, –**
**Ты выткана, дзіўная родная мова.**
**Няма на зямлі таго шчасця і гора,**
**Якога б ты нам перадаць не магла.**
**Няма такіх нетраў, глыбокага мора**
**І гор, праз якія б ты не правяла**
**Мяне на радзіму, туды, дзе сягоння**
**Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй**
**Над спаленай хатай, над родным загонам,**
**Над будучыняй і песняй маёй –**
**Над тым, што было і што век будзе вольным.**
**Народ пранясе цябе, родная мова,**
**Святлом незгасальным у сэрцы сваім**
**Праз цемру і годы змаганняў суровых.**
**Калі ж ападзе і развеецца дым**
**І нівы васкросшыя закаласяцца, –**
**Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,**
**Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце,**
**Цымбалам дасі іх сарэбраны гром**
**І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.**

**Максім Танк**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**люты 2024**

## Люты



**ЛЮТЫ сцюжамі лютуе – ад вясны снягі вартуе.**

*У футра цёплае адзеты,*
*У валёнкі белыя абуты,*
*Ішоў, сваёй хадой сагрэты,*
*Дрымучым лесам месяц люты.*
*Стаяла ночка, пёк мароз,*
*Парыпваў лёгка светлы снег.*
*А на плячах вандроўнік нёс*
*Вялізны поўны белы мех...*
***В.Жуковіч***

### Этымалогія назвы

**"Пытаецца люты, ці добра ногі абуты", - гаварыла прыказка. І сапраўды, зіма ў гэту пару года звычайна была ў самай сіле, лютавала.**

### Народныя прыкметы месяца

- **Прыйдзе люты - спытае, як ты абуты.**
- **Ад лютага зіма збягае цёмнымі начамі.**
- **Завірухі і мяцелі ў лютым адгудзелі.**
- **У лютым востры мароз, кароткая зіма.**
- **Калі ў лютым вераб'і зашыліся пад стрэхі – чакай у госці белакосую мяцеліцу.**
- **Раніца ў лютым хутка займаецца – быць холаду.**
- **Светлыя слупы каля сонца ў лютым – да маразу.**
- **Калі ў лютым вечаровыя зоркі хутка перагараюць, будзе адліга.**
- **У лютым снегапад – да ціхай вясны.**
- **Калі ў лютым месяц ясны, ураджай будзе небагаты.**
- **Які першы дзень лютага, такое і лета будзе.**
- **Моцныя лютаўскія маразы – да гарачага лета.**

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**люты 2024**

**Люты**

**1. Ігнат.** «На Святога Ігната зіма багата».

**2. Грамніцы, Стрэчанне.** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

**5. Агата.** Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

**6. Дарота.** «Па Дароце высахнуць хусты на плоце». **Паўзіміца Аксіння.** «На Аксінні мяце», «Які дзень на Аксінню, такая будзе і вясна»

**11. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».

**12. Стрэчаньскія Дзяды.**

**14. Валянцін.** Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».

**15. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася». «На Грамніцы палавіна зіміцы».

**18. Агата.**

**21.** Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.**

**24. Мацей.** «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». **Улассе, Аўлас.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас», «Ты, Улас, Улас. Ты найміся ў нас скату пасцівіць».

**25. *Дзедава пятніца.**

**26. *Памінальніца.** Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве». **Фаціння.** Заступніца ад хвароб (ліхаманак, трасцы і інш.).

**28. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ільы сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**люты 2024**

## Дзень роднай мовы

**21 лютага** ў нашай школе, як і ва ўсім свеце, адзначалі **Міжнародны дзень роднай мовы**. Гэта свята нагадвае кожнаму, што без мовы народ існаваць не можа. Для вучняў былі арганізаваны разнастайныя мерапрыемствы: флешмоб «Я люблю беларускую мову», віктарына «Перакладчыкі», гульні, музычныя перапынкі. Вучні з радасцю бралі ўдзел у свяце і пашыралі свае веды пра беларускую культуру і этнаграфію.
Такія мерапрыемствы спрыяюць выхаванню патрыятызму школьнікаў і пашырэнню сферы выкарыстання беларускай мовы.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**



# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
люты 2024

**Літаратурна-музычная гасцёўня «Гучы, мая родная мова»**

**21 лютага ў 11 «С» класе прайшла літаратурна-музычная гасцёўня «Гучы, мая родная мова»**, прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы.

Вучні выступалі з паведамленнямі, чыталі вершы, вызначалі імёны пісьменнікаў па прапанаваных радках, слухалі музычныя кампазіцыі, даведаліся цікавыя факты пра беларускую мову.

Дзеці з цікавасцю ўдзельнічалі ва ўсіх этапах мерапрыемства.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**



# Папулярызацыя беларускай мовы



### Квэст-гульня «У пошуках пор года»

**29 лютага** з мэтай папулярызацыі роднай мовы **вучні 8 «Б» класа наведалі Магілёўскую абласную бібліятэку**, дзе прынялі ўдзел у квэст-гульні «У пошуках пор года», прысвечаную Дню роднай мовы.

У ходзе гульні супрацоўнікі аддзела пазнаёмілі вучняў з прыроднымі з’явамі і прыкметамі пор года, з народнымі каляндарнымі святамі. Гульня праходзіла ў займальнай форме з рашэннем заданняў, размешчаных у кнігах. Прыпынкі квэста былі размешчаны, акрамя юнацкага аддзела, у агульнай чытальнай зале, аддзеле абанемента і захоўвання асноўнага фонду.

Праз квэст вучні праверылі сваю эрудыцыю і веды.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**



## 6 лютага 110 год з дня нараджэння Аркадзя Куляшова



Народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў нарадзіўся 6 лютага 1914 г. у мястэчку Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Пісаць вершы пачаў з сямі гадоў. У 1926 г. Клімавіцкая раённая газета “Наш працаўнік” надрукавала яго верш “Ты мой брат”. Аўтару было ў гэты час дванаццаць гадоў. Пасля заканчэння Саматэвіцкай сямігодкі Аркадзь Куляшоў у 1928 годзе паступіў вучыцца ў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. У 1930 годзе ў шаснаццацігадовым узросце ён выдаў свой першы сборнік “Росквіт зямлі”. З 1931 г. па 1933 г. Аркадзь Куляшоў вучыцца на літаратурным факультэце ў Мінскім педагагічным інстытуце. У пачатку 30-х гг. выйшлі зборнікі вершаў і паэм А. Куляшова “Па песню, па сонца!...” і “Медзі дождж” (1933). Этапным творам А. Куляшова, які сведчыў аб сталасці паэта, стала яго паэма “Хлопцы апошняй вайны” (1940).

Пасля вучобы ў Ноўгарадскім ваенна-палітычным вучылішчы А. Куляшоў працаваў у армейскай газеце “Знамя Советов”. У жніўні 1942 г. была напісана паэма “Сцяг брыгады”. У 1946 годзе твор быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. У ваенны час паэт піша такія значныя творы, як “Прыгоды цымбал” і “Дом № 24”. Са снежня 1943 года і да вызвалення Беларусі працуе ў Беларускім штабе партызанскага руху. У 1945 - 1946 годзе Аркадзь Куляшоў — галоўны рэдактар газеты “Літаратура і мастацтва”, потым начальнік сцэнарнага аддзела. З 1958 па 1967 год — галоўны рэдактар на кінастудыі “Беларусфільм”. У 1968 годзе паэту прысвоена высокае званне — народны паэт Беларусі.

У 1970 годзе за пераклады вершаў М. Ю. Лермантава, “Энеіды” І. П. Катлярэўскага, “Спеў аб Гайаваце” Г. У. Лангфела быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Янкі Купалы.

З 1974 года — персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння. У 1976 годзе пабачыла свет апошняя кніга паэта “Хуткасць”. У пасляваенны час найбольш значнымі былі зборнікі вершаў: “Камуністы”, “Новая кніга”, “Сасна і бяроза”, а таксама паэмы “Цунамі”, “Далёка да акіяна”, “Варшаўскі шлях”, цыкл вершаў “Маналог”. Пра выдатнага кіраўніка нацыянальна - вызваленчага руху Кастуся Каліноўскага А. Куляшоў расказаў у драматычнай паэме “Хамуціус” (1975). Раптоўная смерць 4 лютага 1978 г. абарвала паэтычны маналог мужнага паэта -мысліцеля і грамадзяніна.

Яго імем названы Магілёўскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, у весцы Новыя Саматэвічы Касцюковіцкага раёна дзейнічае музей яго імя, у Магілеве імем паэта названа вуліца.

# Літаратурная старонка

**Калейдаскоп**
**люты 2024**



# Цікава ведаць





# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**люты 2024**

## Вобраз моцнай дзяржавы, крэпкай сям'і



Кожная цывілізаваная краіна заклапочана ўмацаваннем сям'і. Гэта той падмурак, на якім трымаецца дзяржава. Моцная сям'я – моцная дзяржава, аснова дабрабыту і шчасця.

## Вобраз чалавека

Дзяржава складаецца з людзей. Чалавек – аснова жыцця на зямлі, аснова сям'і, прадаўжэння роду, моцы дзяржавы. Сімвалам чалавека ў народнай свядомасці з'яўляецца зорка. "Нарадзіўся чалавек – на небе з'явілася яго зорка. Добры чалавек – яго зорка гарыць ярка", – кажуць людзі. Зорка таксама сімвал славы, росквіту творчых сіл. Кажуць: "Зорка першай вялічыні, закацілася яго зорка".





**Рэдкалегія: Кудраўцаў А.(9б),**
**Крупянкова А.(9б),**
**Фруцкая А.(9б),**
**Шаўцоў Д.(9б)**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**